# Вёска мая - Баханы

**Бацькаўшчына**

На старажытных курганах па-над Бесяддзю ракой заснавалася ў свой час адна з самых вялікіх вёсак Хоцімскага раёна - Баханы.

Аб тым, калі яна заснавалася, або хто яе заснаваў, ніякіх звестак няма. Можна меркаваць, што вёска заснавана даўно. У той далёкі дарэвалюцыйны час Баханы нічым не адрозніваліся ад тысячы іншых беларускіх вёсак. Людзі жылі ў цемры і нястачы, з-пад скасабочаных, замшэлых, саламяных стрэх глядзелі падслепаватымі акенцамі невялічкія хаты, якія ціснуліся ўздоўж трох брудных вуліц.

Гнулі сяляне свае спіны на багацеяў. Даглядалі жывёлу, расцілі і ўбіралі збажыну, хоць самім ніколі не хапала хлеба да нові. Праўда, памешчык мог зміласцівіцца і выдаць пуд-другі зерня ў доўг, але пры умове, што селянін адпрацуе ўлетку на панскім полі ўдвая-ўтрая больш. У 1890-1900 гадах многія жыхары вёскі працавалі ў памешчыка. Памешчык усяляк прыгнятаў і эксплуатаваў сялян.

Такога насілля селянін не мог вытрымаць, пачалі праходзіць бунты, паўстанні. У 1905 годзе сяляне вёскі Баханы, узброеныя сякерамі, стрэльбамі, віламі ўзнялі паўстанне супраць мясцовага памешчыка, якое пры дапамозе паліцыі было жорстка задушана. Былі параненыя і забітыя.

У гэты перыяд праходзілі буйныя падзеі, усюды ўспыхвалі паўстанні, набліжаўся 1917 год, год Кастрычніцкай рэвалюцыі, затым грамадзянская вайна. Удзельнікамі грамадзянскай вайны былі і жыхары вёскі Баханы, кавалерысты Аўчыннікаў Мікіта Сямёнавіч, Клецюшнін Дзяніс Якаўлевіч, Макаранка Павел Сяргеевіч і інш.

Пасля гэтых падзей сяляне ўздыхнулі вольна.

Надзеі на лепшае ўсяляла ўжо толькі тое, што не стала памешчыкаў, што ягоную зямлю раздзялілі паміж беднымі сялянамі.

Вёска Баханы ўваходзіла ў гэты час у склад Бярозкаўскага павета. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пачалася рэканструкцыя ўлады, і ў 1926 годзе ў Баханах арганізаваўся сельскі Савет. У састаў сельскага Савета ўваходзілі вёскі Баханы, Енаполле, Канава, Паўлаўка, Юзяфоўка. Першым старшынёй быў абраны Аўчыннікаў Прохар Якаўлевіч.

Бурным у вёсцы быў канец 1929 і пачатак 1930 гадоў. Гэты перыяд знамянальны тым, што ў вёсцы арганізавалася дагэтуль невядомая сялянам, калектыўная гаспадарка. Яна паслужыла прыкладам арганізацыі новага жыцця ў вёсцы. Першынцам новага быў калгас “Герой працы”. Спачатку гэта была невялікая арганізацыя з купкі людзей, згуртаваных паміж сабою адзінай думкай, імкненнем.

Пачаўся калгас з 12 гаспадарак, якія абагульнілі сваю зямлю, коней, транспартныя сродкі. Членамі першай сельгасарцелі сталі былыя кавалерысты Дзяніс Якаўлевіч Касцюшкін, Мікіта Сямёнавіч Аўчыннікаў, браты Марк і Аляксей Кавалёвы, Ганс Юр’евіч Касцюшкін, Карней Карпавіч Зубачоў, Васіль Несцяравіч Барысенка, Пётр Мелехавіч Казакоў, Захар Нікіфаравіч Кучайкоў.

На адным са сходаў члены сельскагаспадарчай арцелі рашылі абраць кіраўніком калектыўнай гаспадаркі актыўнага змагара за ўладу народа Дзяніса Якаўлевіча Касцюшкіна.

Асаблівая цяга да калектыву праявілася ў канцы 1932 года. У гэты час у Баханах быў арганізаваны другі калгас "Новыя Баханы”. Першымі членамі яго сталі змагары за калектыўную гаспадарку Лявон Захаравіч Зубачоў, браты Яфім і

Гаўрыла Зубачовьг, Іван Ціханавіч Старасценка, Гаўрыла Несцеравіч Барысенка, Пётр Андрэевіч Рабцаў.

Аб перавазе вядзення калектыўнай гаспадаркі яны пераканаліся на вопыце калгаса “Герой працы”. І да вясны 1933 года ў сельгасарцель “Новыя Бахань” было прынята 45 сельскіх сем’яў.

Адзінай калектыўнай сям'ёй пачалі ствараць для сябе даброты члены абодвух калгасаў у Баханах. Перажывалі розныя нягоды. Самым цяжкім для іх быў 1933 год - год вялікіх нястач і галадоўкі.

Вялікую дапамогу ў будаўніцтве калгасаў аказвала дзяржава. Каб палегчыць работу ў паляводстве, сюды пачалі дастаўляцца машыны. Упершыню ў 1936 годзе на калгасныя палеткі выйшлі трактары. Першымі трактарыстамі былі Фаіна Патапаўна Рабцава - узнагароджана медалём “За доблестный труд" у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 г.г., Домна Ермалаеўна Казакова, Антон Фёдаравіч Сёмачкін, Пётр Мікітавіч Траханаў, Агафон Андросавіч Кастроў, якія былі накіраваны на курсы трактарыстаў, адкрытыя пры Хоцімскай МТС.

Вялікую ўвагу ўдзяляла партыя прыцягненню мас да ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржаўнымі справамі. У органы народнай улады выбіраліся людзі, дастойныя працягваць працу, пачатую старэйшым пакаленнем па будаўніцтву сацыялістычнага грамадства. Давер'е народа ў 1939 годзе заслужыла прадстаўніца калгаса “Новыя Баханы” трактарыстка Фаіна Патапаўна Рабцава, якая была абрана дэпутатам абласнога Савета.

Але мірная праца ў калектыўных гаспадарках была парушана вераломным нападам фашысцкай Германіі. Каля двухсот ваеннапавінных мужчын узялі ў рукі зброю і сталі на абарону Айчыны. Многія з іх не вярнуліся фронту да дому. 149 жыхароў вёскі загінулі на франтах з нямецкімі акупантамі. У памяць аб загінуўшых у скверы каля Дома культуры стаіць абеліск.

Пастулова залечваліся раны вайны. Жыхары абодвух гаспадарак “Герой працы” і "Новыя Баханы” узяліся за аднаўленне іх. Калгасы толькі пачалі набываць складаную сельскагаспадарчую тэхніку. Наспявала задача ўзбуйнення калгасаў. І яна была рашана ў 1950 годзе. У Баханах быў створаны адзін калгас “Чырвоны маяк", кіраўнікам якога стаў Усцін Апанасавіч Міхаленка.

Ёсць у Баханах і сярэдняя школа, якая ў 1893 годзе была адкрыта і называлась яна ў той час царкоўна-прыходскай. Дзеці многіх патомных хлебаробаў атрымалі адпаведную адукацыю, вучацца і працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Больш баханцоў атрымалі прафесіі настаўнікаў, у вышэйшых навучальных установах працуюць два кандыдаты навук, больш трыццаці аднавяскоўцаў працуюць аграномамі, заатэхнікамі, ветэрынарнымі работнікамі. Выраслі тут медыкі і юрысты. Служаць у радах Арміі афіцэры і радавыя салдаты.

У 1951 годзе ў Баханах адкрываецца сельская бібліятэка. Першым бібліятэкарам была Радзькова Вольга Дзянісаўна. Зараз бібліятэка знаходзіцца ў асобным памяшканні з сённяшнім фондам ў 13 917 кніг.

Змяніла сваё аблічча і сама вёска. Асфальтаваныя вуліцы, электрычнасць, амаль у кожным доме ёсць газ, тэлевізары, халадзільнікі, у многіх жыхароў стаяць тэлефоны.

Уладзімір РАБЦАЎ, бібліятэкар.

---

**Рабцаў, У.** Вёска мая - Баханы / Уладзімір Рабцаў // Шлях Кастрычніка. — 2001. — 29 мая. — С. 2.

*Заснаванне вёскі Баханы Хоцімскага раёна.*